*Гоўзіч І.М.*

**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. V КЛАС**



**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ АБАГУЛЬНЕННЯ**

**1. Міні-віктарына:**

1) Дапоўніце народныя прыкметы:
Шмат снегу — шмат… (хлебу)
Шмат вады — шмат… (травы)
Жабы квакаюць —… (быць дажджу)
Дым з каміноў падымаецца ўверх — (будзе добрае надвор’е).

2) Адкажыце на жартоўныя загадкі:
Чым заканчваецца апавяданне? (Літарай «е»)
У авадня спераду, а ў вавёркі ззаду. (Літара «а»)

3) Аднавіце прыказкі, каб яны сталі правільнымі:
Калі топішся, малога павучай.
Ладзь калёсы зімой, за саломінку схопішся.
Старога паважай, а сані летам.

4) Адгадайце метаграму:

У агародзе ён на градцы,
Пад сонцам, як кумач, гарыць,
«М» на «л» змяню ў пачатку —
Паверхняй мэблі заблішчыць.

(Мак — лак)

5) Адгадайце загадку:

Расчашу сама адну я,
Сама заплятуся,
А другое не крану,
Пагладзіць баюся.
Шасне грэбень востры —
Травы ніц кладуцца.
Што гэта за сёстры,
Як яны завуцца?

(Косы)

2. **Запоўніце дыяграму Вена**, упісаўшы ў адпаведныя акружнасці прыкметы, якія ўласцівыя толькі фальклорным казкам і толькі літаратурным казкам. У тым месца, дзе акружнасці перасякаюцца напішыце тыя прыкметы, якія ўласцівы і літаратурным і фальклорным казкам:



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Напішыце **ліст-падзяку пісьменніку** (аднаму на выбар) з творамі якога вы пазнаёміліся ў V класе.

4. Запоўніце табліцу:

| **Пісьменнік** | **Твор** | **Галоўныя героі** |
|---|---|---|
| Якуб Колас | Дарэктар | Міхал, Костусь, Алесь, Яська |
| Алесь Гарун | | |
| Міхась Лынькоў | | |
| Якуб Колас | У старых дубах | |
| Анатоль Кудравец | | |
| Генрых Далідовіч | | |
| Уладзімір Караткевіч | | |

5. **Паназірайце над паводзінамі якой-небудзь жывёлы (сабакі, ката і г.д.), свае назіранні запішыце**. Праз некалькі дзён дапоўніце іх новымі. Распытайце сваіх бацькоў і сяброў, ці ведаюць яны якую-небудзь цікавую гісторыю пра жывёл, іх паводзіны, характар. Паспрабуйце на аснове сваіх назіранняў і апавяданняў дарослых і сяброў **напісаць казку** (апавяданне) пра жывёл.

6. Падрыхтуйце **разгорнутае паведамленне на тэму «Кім я ўяўляю сябе ў будучым»**. Афарміце яго ў пісьмовай форме, прыкладзіце партрэт свайго героя, яго біяграфію, радавод. Раскажыце пра самы цікавы выпадак пра сваё жыццё ў будучым.

7. Падрыхтуйце невялікае вуснае выступленне на тэму «З прачытанага ў V класе асабліва запомнілася…».

8. Да вас у клас павінен прыйсці ваш любімы пісьменнік, складзіце **анкету** з пытанняў, на якія вы хочаце атрымаць адказ.

9. Разам з аднакласнікамі падрыхтуйце **праект** «Чароўная краіна Літаратура». Заданне для мастакоў — намаляваць карту краіны Літаратура, для пісьменнікаў — прыдумаць гімн Краіны і назвы геаграфічных аб’ектаў: гара Паэзія, возера Загадак і г.д.; для гісторыкаў — расказаць пра гісторыю гэтай краіны і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі (іх павінна стаць 10), у якіх пазначаюцца імёны і прозвішчы аўтараў і іх творы :




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ